**18 кастрычніка 2023 г. - 500 гадоў з дня нараджэння ГАННЫ ЯГЕЛОНКІ (1523-1596), вялікай княгіні Вялікага Княства Літоўскага, каралевы Польшчы, якая надала Кобрыну і Гарадцу магдэбурскае права і гербы**



500-гадовы юбілей Ганны Ягелонкі - чарговая нагода ўспомніць пра ролю жанчын у гісторыі Кобрына. З 1532 года горадам паслядоўна кіравалі польскія каралевы Бона Сфорца, Ганна Ягелонка і Канстанцыя Аўстрыйская. Усе яны сваімі дзеяннямі пакінулі значны след на кобрынскай зямлі.

Ганна Ягелонка нарадзілася 18 кастрычніка 1523 года ў г. Кракаве (Польшча). Яна была чацвёртым дзіцем караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога (1467-1548) і Боны Сфорцы (1494-1557).

Пра першую палову жыцця Ганны вядома няшмат. Бацькі не здолелі выдаць яе замуж, як і наступны кароль і вялікі князь, брат Ганны Жыгімонт II Аўгуст. Яна адмовілася ад шлюбу са шведскім прынцам Юханам Вазам і іншымі прэтэндэнтамі. Да 52 гадоў Ганна жыла старой дзевай, займаючыся чыста жаночымі справамі: вышыўкай і дабрачыннасцю. Доўгія гады чакання не толькі навучылі яе цярпенню і спакою, але і ўсялілі ўпэўненасць у тое, што жанчына таксама можа быць добрым манархам.

З 1576 года замужам за трансільванскім ваяводам Іштванам Батары (Стафанам Баторыем). Шлюб з Ганнай быў умовай абрання Стафана Баторыя (1533-1586) на трон Польшчы і ВКЛ. 1 мая 1576 года пасля цырымоніі шлюбу Ганна і Стафан былі каранаваны польскай каронай.

У 1581 годзе Ганна атрымала ад мужа вена ў памеры 30 тысяч злотых, запісаных на маёнтках у ВКЛ, у тым ліку Кобрынскую эканомію і Пружаны.

Пасля смерці Стафана Баторыя (1586) Ганна паводле закону мела права ўзначаліць Рэч Паспалітую, але яна не здолела атрымаць уладу, у выніку чаго пачалося новае бескаралеўе. Тым не менш Ганна адыгрывала даволі ўплывовую ролю пры першых элекцыйных соймах (дзе

выбіралі караля). Менавіта яна дамаглася абрання на прастол Польшчы і ВКЛ свайго пляменніка, сына сваёй сястры Кацярыны, і ў 1587 годзе на троне апынуўся Жыгімонт III Ваза (1566-1632).

У 1586 годзе Кобрын дастаўся каралеве-ўдаве і вялікай княгіні Ганне Ягелонцы. Яна цалкам атрымала ў спадчыну ад маці, каралевы Боны, актыўнасць у палітычных і гаспадарчых справах і таксама займалася новаўвядзеннямі. Каб стымуляваць развіццё рамёстваў і гандлю, павялічыць даходнасць гарадской гаспадаркі, каралева вырашыла даць Кобрыну магдэбургскае права (самакіраванне). У 1589 годзе Ганна Ягелонка асабіста прыбыла ў горад і ўрачыста ўручыла жыхарам Кобрына прывілей, падпісаны нядаўна абраным каралём Жыгімонтам III Вазай (1587-1632). Адначасова 10 снежня 1589 года магдэбургскае права атрымаў Гарадзец. На паўгода раней – 6 мая 1589 года – горад Пружаны.

Такім чынам, Кобрын стаў самакіравальным, вольным горадам. Згодна з прывілеем, кобрынскія жыхары (домаўласнікі) з гэтага часу маглі мець уласны адміністрацыйны орган улады - магістрат. У яго яны абіралі ратманаў (радцаў), з ліку якіх выбіраліся бургамістры. Аднак над усімі стаяў войт, які абіраўся толькі са шляхецкага асяроддзя і валодаў паўнамоцтвам сцвярджаць абраных членаў магістрата. Ён жа старшынстваваў у мясцовым гарадскім судзе, дзе яму асісціравалі лаўнікі (засядацелі). Гараджанам дазвалялася свабодна займацца рамяством або гандлем. Жыхары Кобрына атрымалі права карыстацца агульнадзяржаўнымі мерамі і вагой, арганізоўваць штотыдзень, па панядзелках, гандаль на рынку, а двойчы за год - восенню і зімой - праводзіць кірмашы.

Кобрыну таксама дараваўся герб - шчыт з выявамі Святой Ганны і Маці Божай з дзіцем, і пячатка. На тэрыторыі Ніжняга замка была пабудавана ратуша. Увядзенне магдэбургскага права прыкметна ажывіла гаспадарчае жыццё горада. Рамеснікі і купцы аб'ядналіся ў цэхі. Узмацніўся тавараабмен паміж Кобрынам і навакольнымі сёламі, часцей сталі з'яўляцца гандлёвыя судны на Мухаўцы.

Ганна Ягелонка памерла на 72 годзе жыцця 9 верасня 1596 года ў Варшаве. Пахавана ў капліцы Жыгімонта Кракаўскага кафедральнага сабора. Яна была апошнім членам дынастыі Ягелонаў. Пасля Ганны Ягелонкі ўладальніцай Кобрына апынулася жонка Жыгімонта III, Канстанцыя, дачка

аўстрыйскага эрцгерцага. Канстанцыя Аўстрыйская (1588–1631) валодала горадам і эканоміяй з 1605 года да 1631 года.

Польскі пісьменнік Юзаф Ігнацы Крашэўскі ў сваім цыкле гістарычных раманаў «Гісторыя Польшчы» напісаў раман «Інфантка» (1884). Галоўная гераіня твора – Ганна Ягелонка, апошняя прынцэса роду Ягелонаў. Майстар прозы намаляваў яе няшчаснае жыццё, барацьбу за ўладу, любоў да Генрыха Валуа, надзеі і мары.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Аб жыцці і дзейнасці Ганны Ягелонкі**

**Масляніцына, І. А.** Ганна Ягелонка / І. А. Масляніцына // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 29.

**Грыцкевіч, А. П.** Ягелоны. Ганна / А. П. Грыцкевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 230.

**Ганна Ягелонка** // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : [у 3 т.]. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 776.

**Ганна Ягелонка** // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : [у 3 т.]. – Мінск, 2010. – Т. 3. – С. 154.

**Грыцкевіч, А.** Ягелоны. Ганна (18.10.1523, Кракаў – 9.9.1596) / Анатоль Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 286.

**Ганна Ягелонка** // Памяць. Кобрынскі раён : гіст.-дакум. хроніка. Мінск, 2002. - С. 47.

**Марціновіч, М. В.** Вялікія княгіні Вялікага Княства Літоўскага : біяграфічныя даследаванні / М. В. Марціновіч. – Мінск : Цымбераў, 2021. – 352 с., [8] л. іл.

Гл. с. 217, 345.

**Марціновіч, А**. Перад Амура стралой – і цар не герой. Кацярына Ягелонка : [сястра Ганны Ягелонкі] / Алесь Марціновіч // Святло далекіх зорак : гістарычныя апавяданні, эсэ : у 2 кн. / Алесь Марціновіч. - Мінск, 2019. - Кн. 1. – С. 339–351.

**Niedźwiedzka, M.** Anna Jageiellonka / Magdalena Niedźwiedzka. – Warszawa, 2019. – 398 s.

**Wrede, M**. Anna Jagiellonka : szkic biograficzny / Marek Wrede. – [Warszawa] : Zamek Królewski w Warszawie, [1986?]. – 31, [15] s.

**Kraszewski, J. I.** Infantka : powieść historyczna : Anna Jagiellonka / Józef Ignacy Kraszewski. – Warszawa : Ludowa Spoldzielnia Wydawnicza, 1972. – 444 c. – (Jozef Ignacy Kraszewski. Dzieje Polski).

**Плиско, Н. М**. Кобрин : историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск : Полымя, 1987. – 95 с. : ил. – (Города Белоруссии).

**Беларускі** каляндар. 2023 год. **Ганна Ягелонка** // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2022. - № 8. - С. 20 (дадатак).

**Каўтунюк, М.** Герб Пружан — дараванне Ганны Ягелонкі / Марына Каўтунюк // Раённыя будні. — 2022. - 26 кастрычніка (№ 84). — С. 8 : фат.

**Войтик, И.** Три королевы Речи Посполитой : зенит и закат династии Ягеллонов / Ирина Войтик // Государственный контроль: анализ, практика, комментарии. - 2017. - № 4. – С. 82–88.

**Масляніцына, І.** Асенняя кветка Ягелонаў : [Ганна Ягелонка] / Ірына Масляніцына // Алеся. - 2012. - № 9. - С. 20–22.

**Гулецкий, Д.** Последняя кровь Ягеллонов : [Анна Ягеллонка] / Дмитрий Гулецкий // СБ. Беларусь сегодня. - 2010. - 19 января. - С. 9.

**Масляніцына, І.** Восеньская кветка Ягелонаў / Ірына Масляніцына, Мікола Багадзяж // Женский журнал. – 2009. – № 2. – С. 66-67.

Кобрынскі раён
Кобрын
Гарадзец
Вялікае Княства Літоўскае
Магдэбургскае права
Ягелонка Ганна
Каралі